
ВЫРАТАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ 3

НАПЕРАД У МІНУЛАЕ 5




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

14 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 115 (30249)


## КОРАТКА

• **Унікальны перасоўны музей «Цягнік Перамогі» прыбудзе ў Беларусь 21 чэрвеня.**



• МАЗ плануе адкрыць зборачную вытворчасць электратранспарту ва Уфе.

• **Асобныя ўчасткі Пружанскага раёна перададзены пад ахову нацпарку «Белавежская пушча» для абароны рэдкіх птушак і грыбоў.**

• Археолагі аднавілі падводныя даследаванні на Бярэзіне па слядах войска Напалеона.

• **БЧ прызначыла 14 дадатковых цягнікоў да рэспубліканскага свята «Купалле» ў Александрыі.**

• Вучылішчы алімпійскага рэзерву будуць працаваць па-новаму. Мінспорт унёс карэктывы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржсакратар Савета бяспекі** *(аб антытэрарыстычных вучэннях у Брэсцкай вобласці)*:

*«Вядома ж, акрамя знешніх крыніц пагроз мы ацэньваем і абстаноўку, якая можа складвацца ўнутры краіны. Заўсёды ўсё пачынаецца знутры, таму мы павінны быць гатовы і да нейтралізацыі пагроз, і да забеспячэння бяспекі на тэрыторыі сваёй краіны. Гэтым выклікана неабходнасць правядзення такіх вучэнняў з сіламі і сродкамі дзяржаўнай сістэмы рэагавання на акты тэрарызму».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Лёгка вам не будзе»

## Якія задачы перад прызначанымі на высокія пасады паставіў Прэзідэнт — падрабязнасці кадравага дня

**У Палацы Незалежнасці — кадравы дзень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў новых кіраўнікоў дзяржаўных органаў, мясцовых органаў улады. Па традыцыі іх работа пачынаецца з задач і парад асабіста ад Прэзідэнта.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт назначыў Наталлю Паўлючэнка міністрам працы і сацыяльнай абароны, Марата Маркава — міністрам інфармацыі. Сяргей Малуноў прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кыргызскую Рэспубліку. Аляксандр Кохан — новы памочнік Прэзідэнта па Мінскай вобласці. Таксама кіраўнік дзяржавы даў згоду на прызначэнне Ігара Бузоўскага рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі. Ігар Луцкі цяпер будзе кіраваць тэлеканалам АНТ.

Новыя кіраўнікі з'явіліся ў мясцовых органах улады, Прэзідэнт даў згоду на іх прызначэнне. Андрэй Стрыгельскі — намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама, адказны за сацыяльную сферу і ідэалагічную работу, Раман Жук — старшыня Баранавіцкага райвыканкама, Аляксандр Корж — старшыня Маларыцкага райвыканкама, Аляксей Гарбуль — старшыня Расонскага райвыканкама. Валерый Вараніцкі ўзначаліць Цэнтральны раён Мінска, Мікалай Палякоў — Партызанскі раён сталіцы. Андрэй Кузняцоў прызначаны намеснікам міністра прамысловасці, Аляксей Жалдыбін — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у Дубаі, Мікалай Рагожнік — генеральны консул у Санкт-Пецярбургу.

### «Гэта павінны быць выключныя людзі»

Ігар Бузоўскі да прызначэння рэктарам Акадэміі кіравання працаваў намеснікам міністра інфармацыі. Ён кандыдат сацыялагічных навук, мае вялікі практычны досвед працы ў дзяржаўных органах. «Мяне заўсёды насцярожвала, калі чыноўнік піша дысертацыю. Я доўга вагаўся наконт згоды», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў заўважыў, што Ігар Бузоўскі выкладае ў Акадэміі кіравання, таму гэтая ВНУ яму добра знаёмая.

«Я хачу звярнуць увагу, што памылкі там быць не павінна. Гэта павінен быць выключна надзейны, выключна прафесійны чалавек. Не павінна быць у краіне лепшых, чым ён. Гэта сур'ёзная акадэмія, дзе рыхтуюцца кіруючыя кадры», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што вучыцца ў акадэміі павінны толькі тыя людзі, каму сапраўды патрэбна гэтая адукацыя, а не тыя, хто паступіў туды «для птушачкі».

СТАР. 2

Жыллё

# Аднапакаёвыя кватэры імкліва даражэюць

## Прычына — даступныя крэдыты і ажыятажны попыт



**Сёлета попыт на жыллё досыць актывізаваўся і больш стаў падобны на доўгатэрміновую тэндэнцыю. Па словах дырэктара агенцтва нерухомасці «БелГЦН» і ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, кватэры ў Мінску на другасным рынку жылля падаражэлі ўжо не менш чым на 6 %.**

СТАР. 4

Праверана на сабе. Жаночы погляд

# ЖАЛЕЗНЫЯ «ПТУШКІ» ШЫРОКАГА ФУНКЦЫЯНАЛУ

## Ці лёгкія ў асваенні беспілотнікі і якія задачы яны выконваюць?

**Беспілотнікі — «вочы» Узброеных Сіл. Яны стаяць у страі кожнай арміі, якая развіваецца. Іх эфектыўнасць неацэнная: разведка, кіраванне агнём, перахоп паветраных цэляў, нанясенне ўдараў па наземных і марскіх аб'ектах... У беларускай арміі — каля дзясятка найменняў разведвальных дронаў: «Бусел-10», «Суперкам-С100» (С150 і С350), «Беркут-2», «Маскіт», «Фармула». Іх галоўная задача — разведка мясцовасці. Сёння мы раскажам пра найлепшыя з іх.**

СТАР. 3



ISSN 1990 — 763X

24115

9 771990 763008


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Лёгка вам не будзе»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Трэба выпрацаваць дакладную сістэму, хто павінен атрымліваць адукацыю ў акадэміі. Тым больш там жа ў асноўным другую адукацыю атрымліваюць. Там адбор павінен быць, як раней адбіралі ў партыю ці ў паляўнічы камітэт, — немагчыма было ўступіць», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Максім Рыжанкоў расказаў, што ўсе выпускнікі акадэміі, якія атрымліваюць там першую вышэйшую адукацыю, размяркоўваюцца ў дзяржаўныя арганізацыі, органы ўлады. На бюджэтную форму навучання ў акадэмію штогод набіраюць 100 чалавек, якіх вобразна называюць «залатой сотняй». «Гэтая «залатая сотня» — гэта павінны быць выключныя людзі, патрыёты да мозгу касцей», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца тых, хто атрымлівае ў Акадэміі кіравання другую вышэйшую адукацыю, то да іх, паводле слоў Прэзідэнта, павінен быць яшчэ больш строгі падыход і адбор. Галоўнае пытанне — трэба ці не трэба яго там навучаць. «Чохам нічога не павінна вырашацца», — рэзюмаваў ён. Да набору слухачоў для павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі таксама трэба падыходзіць выключна прынцыпова, акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да новага рэктара Акадэміі кіравання, Прэзідэнт папярэдзіў: «Цяжкая праца. Прытым пад маім ужо кантролем. Я ўвесь час буду задаваць у Адміністрацыі пытанне: як, дзе і іншае». Таксама, па словах кіраўніка дзяржавы, усіх чыноўнікаў, дзяржслужачых, членаў урада, супрацоўнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта неабходна прыцягваць да выкладання ў акадэміі. «Любы дзяржаўны служачы валодае вялікім досведам і інфармацыяй. І данесці гэта да слухачоў ці студэнтаў акадэміі вельмі важна», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што моцна сумняваўся, разглядаючы кандыдатуры на пасаду рэктара Акадэміі кіравання. «Я хачу, каб ты адчуў адказнасць за сваю будучую працу. Вельмі хачу. Але лёгка не будзе, гэта я табе адразу скажу», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Ігара Бузоўскага.

### «Вы — прэзідэнты на сваёй тэрыторыі»

Адна з асноўных задач для новых старшынь райвыканкамаў і кіраўнікоў адміністрацый раёнаў Мінска — разабрацца з кадрамі. «Маю ацэнку старшынь райвыканкамаў і кіраўнікоў адміністрацый у гарадах вы ведаеце. Вы па розных прычынах (часам ад сябе не залежных), здараецца, не дапрацоўваеце, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Я вас адразу арыентую: вы — прэзідэнты на сваёй тэрыторыі. Вы арганізоўваеце ўвесь працэс, вы павінны за ўсімі працэсамі назіраць. Пачынаючы ад правоў чалавека. У нас ніякіх амбудсменаў няма, Прэзідэнт і вы, мае людзі на месцах, займаецеся правамі чалавека. Мы не павінны ствараць у грамадстве залішняга напружання, але і вольніцы не павінна быць у парушэнні законаў. Таму паглядзіце на ўсіх, з кім вы будзеце працаваць». Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што шанц трэба даваць усім, хто хоча працаваць.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што краіна ўступіла ў электаральны перыяд. І задача, агучаная падчас даклада кіраўніка ЦВК Ігара Карпенкі, — правесці выбары годна і не пакрыўдзіць людзей — датычыцца і старшынь райвыканкамаў. «Усё павінна быць дакладна, прыгожа, у інтарэсах нашай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Тым больш нашы так званыя апаненты ўжо так схіблі, што далей няма куды, — прыгадаў ён нядаўнія так званыя «выбары», якія праводзілі збеглыя. — Ужо ні яны, ні іх куратары не могуць нас папракнуць, што мы выкарыстоўваем адміністрацыйны рэсурс. З 7 мільёнаў выбаршчыкаў у іх ажно 6 тысяч прагаласавала. Нават дыяспары не сталі за іх там галасаваць. Кажуць, што ці то 200, ці то 300 тысяч з Беларусі з'ехалі, дык хоць іх арганізуйце... Таму не ім нас папракаць. Мы праводзім выбары для сябе. Не глядзіце па баках».

«Нядрэнны ўраджай на палях — гэта ваш клопат, — акрэсліў яшчэ адну задачу кіраўнік дзяржавы. — Як бы ні было складана, трэба заканчваць нарыхтоўку кармоў і пакрысе рыхтавацца камбайны да ўборкі хлябоў». Ён падкрэсліў, што ўжо цяпер трэба высвятліць сітуацыю з кадрамі і там, дзе гэта неабходна, прыцягваць да ўборачнай кампаніі людзей з гарадоў. Прэзідэнт папярэдзіў, што кантроль за ўборачнай кампаніяй будзе вельмі сур'ёзны, таму што страты ўраджаю дапусціць нельга, а лішкі ёсць куды выкарыстоўваць.

«Увогуле, мужыкі, нічога новага. Усё старое добра забытае ці не забытае — у гэтым кірунку дзейнічайце. Яшчэ раз падкрэсліваю: у рамках свайго раёна — адказнасць уся на вас, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — Першая асоба ў раёне — гэта вы, старшыня райвыканкама».

### Трэба нефармальна ставіцца да ўсіх пытанняў

У размове з Маратам Маркавым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яго аўтарскую праграму на тэлеканале АНТ. «Міністэрства — гэта будзе твая асноўная пасада. А далей я буду толькі рады, калі будзеш спраўляцца і весці сваю перадачу. Але не ва ўрон асноўнай рабоце», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да новага міністра інфармацыі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба трымаць высокую планку аўтарскай праграмы Марата Маркава і пры гэтым рыхтаваць замену, якая будзе яе ўтрымліваць, калі прыйдзе час.

Адной з галоўных задач для міністра інфармацыі Прэзідэнт назваў размеркаванне фінансавых сродкаў на рэалізацыю розных праектаў у СМІ і кантроль за эфектыўнасцю іх выкарыстання. «Галоўнае — грошы, фінансы, вы іх павінны трымаць у руках і кожнаму даваць па капейцы туды, куды трэба. Гэта галоўнае для мяне. Ну, арганізацыйна крыху дапаможаце. І яны ж павінны варушыцца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Задача для новага кіраўніка тэлеканала АНТ — прыўнесці нешта новае. Тым больш што досвед работы на тэлебачанні ў Ігара Луцкага ёсць, ён добра разбіраецца ў СМІ. І гэта важна, бо, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, журналісты — людзі спецыфічныя. «Да яго прэтэнзій не прад'явіш — аксакал прыйшоў, — ахарактарызаваў новага кіраўніка АНТ Прэзідэнт. — Далей хай толькі дадае. Далей яго будуць ацэньваць па тым, як ён будзе працаваць, а так аўтарытэт у яго добры».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што на гэтую пасаду разглядаліся і іншыя кандыдатуры, у тым ліку і вядомыя журналісты. Але, па яго словах, яны не кіраўнікі, а ўзначаліць канал павінен чалавек, які мае досвед кіраўніка. «АНТ зарэкамендаваў сябе прыстойна, таму любая памылка будзе заўважана гледачамі, насельніцтвам, не кажучы ўжо пра Адміністрацыю Прэзідэнта і так далей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў міністру інфармацыі не губляць і таленавітых журналістаў з поля зроку і даць ім магчымасць для кар'ернага росту.

Асноўная задача міністра працы і сацыяльнай абароны Наталлі Паўлючэнка — удасканаліць сістэму падтрымкі шматдзетных сем'яў, каб выключыць выпадкі злоўжывання з боку нядбайных бацькоў. «Не сакрэт, што ў нас шмат сем'яў шматдзетных, каго ўвогуле да рубля падпускаць нельга. І гэтыя грошы да дзяцей не даходзяць: іх прапіваюць ці яшчэ неяк. Таму трэба выпрацаваць сістэму, каб, падтрымліваючы шматдзетных (а мы будзем іх падтрымліваць, гэта пытанне нумар адзін для нас, і па жыллі і гэтак далей), устанавіць бар'ер і крытэрыі, як данесці грошы да дзяцей, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Нам трэба вельмі акуратна, не фармальна ставіцца да гэтых пытанняў. Каб грошы атрымлівалі тыя, каму яны прызначаны».

Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што асаблівых праблем у новага пасла ў Кыргызстане Сяргея Малунова быць не павінна. «У нас бліскучыя адносіны з усімі кіраўнікамі ў Кыргызстане, з уплывовымі людзьмі там. Трэба вызначыцца, па якіх кірунках мы будзем з імі супрацоўнічаць», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што ў савецкія часы Беларусь часта закупляла ў Кыргызстане насенне буракоў. Калі гэта актуальна для Беларусі і цяпер, варта вярнуцца да гэтага пытання, лічыць Прэзідэнт. «І яшчэ шэраг кірункаў. Яны вельмі зацікаўлены з намі працаваць: ад сельскай гаспадаркі да ваенна-прамысловага комплексу. Таму вельмі спадзяюся, што ў вас там не ўзнікне ніякіх праблем», — падсумаваў беларускі лідар.

У свайго новага памочніка Аляксандра Кохана Прэзідэнт спытаў, ці не баіцца той ісці працаваць у Мінскую вобласць. «Страшнавата. Але разумею, што абавязаны выконваць тыя задачы, якія вы ставіце», — адказаў ён. «Гэта вочы і вушы ў гэтай цэнтральнай вобласці», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Ну што, мужыкі, не буду вам наказваць і разумныя словы гаварыць. Вы ўсе людзі падрыхтаваныя, практычна ўсіх бачыў я ў справе», — падсумаваў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

### Задачы зразумелыя — трэба працаваць

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА** ў размове з журналістамі заўважыла, што безумоўным прыярытэтам развіцця нашай дзяржавы была і застаецца сацыяльная палітыка, падтрымка грамадзян. «Меры падтрымкі, якія сёння ёсць, вельмі значныя. Тыя сродкі, якія акумулююцца ў выніку работы нашай эканомікі, пераразмяркоўваюцца на сацыяльную сферу — да іх трэба ставіцца вельмі ашчадна. І памятаць, што, калі гэтыя сродкі накіроўваюцца на падтрымку сем'яў, — яны павінны ісці на дзяцей, на карысць сям'і. Адна з нашых галоўных задач — развіццё дэмаграфіі», — падкрэсліла міністр.

**Марат МАРКАЎ, міністр інфармацыі,** расказаў журналістам, што ніякай рэвалюцыі ў дзейнасці міністэрства праводзіцца не будзе. Паколькі тая лінія, па якой працавала Міністэрства інфармацыі апошнія некалькі гадоў, правільная. «Будзе дакладная паслядоўная работа, — сказаў ён. — Перыяд цяпер надзвычай цікавы. Перадвыбарная кампанія ўжо пачалася. І размова ідзе аб тым, каб паслядоўна працаваць далей, а не рабіць рэвалюцыю ў пэўнай сферы». Па словах міністра, перад беларускай інфармацыйнай сферай стаяць дзве стратэгічныя задачы. Першая — забяспечыць уласнае дамінаванне на інфармацыйным полі. «Мы дасягнулі гэтага ў пэўнай ступені дзякуючы традыцыйным СМІ і той увазе, якую мы ўдзяляем новым медыя. І гэта работа будзе працягнута», — сказаў Маркаў. Другая стратэгічная задача — данясенне праўдзівай інфармацыі аб Беларусі на знешні контур. Для вырашэння гэтых задач, па словах міністра, будуць прыцягнуты і рэгіянальныя СМІ. Марат Маркаў заўважыў, што нядаўні медыяфорум паказаў: у рэгіёнах шмат таленавітых журналісцкіх кадраў. «Задача міністэрства — бачыць гэтых людзей і даваць ім магчымасць для росту», — падсумаваў ён.

**Новы старшыня праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны канал» Ігар ЛУЦКІ** адзначыў, што ў новую работу трэба ўключацца ўжо сёння. «АНТ — вядучы канал, гэта накладае на мяне дадатковую адказнасць. Але мне прасцей, таму што там працуе вельмі добры калектыў, які заўсёды адстойваў дзяржаўныя інтарэсы. Журналісты там маюць стойкую грамадзянскую пазіцыю — у гэтым плане мне прасцей», — сказаў ён.

**Ігар БУЗОЎСКІ** прызнаўся журналістам, што яго прызначэнне на пасаду рэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце — нечаканасць, але і адначасова вялікі гонар і адказнасць. «Прэзідэнт сказаў нядаўна, і гэты выраз стаў крылатым: «Час выбраў нас». Для Акадэміі кіравання сёння звышактуальна скарыстацца магчымасцямі, якія мы сёння маем. У мірны час, у час, калі мы знаходзімся падчас сусветных пертурбацый, знайсці свой шлях і знайсці сваю стратэгію. Досвед, які ёсць у Рэспубліцы Беларусь, — унікальны, досвед, які ёсць у нас, — унікальны. І я спадзяюся, што сумесная работа з дзяржаўнымі органамі кіравання, з людзьмі, якія працуюць у розных сферах, будзе плённай і дазволіць нам фарміраваць якасных кіраўнікоў для будучыні Беларусі», — адзначыў Ігар Бузоўскі.

**Старшыня Маларыцкага райвыканкама Аляксандр КОРЖ** расказаў, як будзе вырашаць пастаўленыя Прэзідэнтам задачы. «Паколькі Маларыцкі раён — гэта сельскагаспадарчы раён, найбольшы акцэнт мы будзем рабіць на гэтым. Не пакінем без увагі сферу адукацыі. Безумоўна, будзем працаваць з кадрамі. Гэта асноўнае», — сказаў ён.

---

Міжнародны вектар

# «Беларусь выступае за раўнапраўны дыялог»

## Ігар СЕРГЯЕНКА правёў рабочую сустрэчу з паслом Палесціны ў Беларусі

**Сустрэча ініцыявана палесцінскім бокам з мэтай абмеркавання пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на тое, што дэпутацкі корпус высока цэніць актыўную грамадзянскую і палітычную пазіцыю Ахмеда Махамеда аль-Мадбуха па пытанні развіцця адносін паміж дзвюма краінамі.**

Ігар Сергяенка выказаў упэўненасць, што тыя гістарычныя сувязі, якія склаліся паміж Беларуссю і Палесцінай яшчэ з часоў БССР, служаць трывалай асновай для ўзаемнага супрацоўніцтва. Ён таксама зазначыў, што ў нашай краіне з павагай ставяцца да палесцінскага народа.

Кажучы аб супрацоўніцтве на міжнароднай арэне, Ігар Сергяенка нагадаў, што Беларусь штогадовым галасаваннем у ААН па блоку блізкаўсходніх рэзалюцый традыцыйна аказвае Палесціне падтрымку, фактычна супастаўную з падтрымкай арабскіх краін. «Думаю, што і ў Палесціне ведаюць пра нас, нашу краіну, у тым ліку дзякуючы пасольству, як аб міралюбівай дзяржаве, якая прасоўвае актыўныя пазіцыі па развіцці і мірным існаванні нашых дзяржаў», — выказаў перакананне спікер.

Ён падкрэсліў, што Беларусь выступае за раўнапраўны дыялог. «Гэта фундаментальны прынцып для нас, — удакладніў Ігар Сергяенка. — Мы гатовы да развіцця збалансаваных адносін з партнёрамі ў розных рэгіёнах свету. Але, на жаль, сёння светаўладкаванне мяняецца. І мы бачым, як, здавалася б, замарожаны канфлікт на прыкладзе вашага рэгіёна можа ў найкарацейшыя тэрміны ператварыцца ў гарачую фазу, якую сёння складана пераадолець, прытым пераадолець дастаткова хутка. Мы бачым, што сёння прагледзецца нядзольнасць вядучых міжнародных арганізацый вырашыць праблемы, а ў шэрагу выпадкаў і нежаданне асобных дзяржаў прымаць эфектыўныя меры па ўрэгуляванні сітуацыі для таго, каб сёння не гінулі мірныя жыхары. Больш за тое, мы бачым, як гэтыя дзяржавы праводзяць палітыку санкцый, напружанасці і далейшых канфліктных сітуацый».

Адзінай альтэрнатывай у такой сітуацыі, па меркаванні Старшыні Палаты прадстаўнікоў, з'яўляюцца аб'ядноўваючыя міралюбівыя ініцыятывы, сугучныя тым, якія прапануе сусветнай супольнасці Беларусь. «Нікому не патрэбна сёння вайна. Мы хацелі б і жадаем найхутчэйшага вырашэння гэтай сітуацыі, якая складваецца, — акцэнтаваў увагу спікер. — Мы за тое, каб гэтая сітуацыя вырашылася як мага хутчэй».

У сваю чаргу, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Палесціны ў Рэспубліцы Беларусь Ахмед Махамед аль-Мадбух выказаў удзячнасць Рэспубліцы Беларусь за тую падтрымку, якая аказваецца яго краіне на міжнароднай арэне.

Пасол падзякаваў беларускаму боку за разуменне таго, што адбываецца сёння ў Палесціне, а менавіта канфлікту, які разгарэўся 7 кастрычніка 2023 года. Ён таксама перадаў Ігару Сергяенку прывітанне ад кіраўніка парламента Палесціны і яго жаданне сустрэцца. Парламент Палесціны гатовы да стварэння групы дружбы з парламентам Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ЖАЛЕЗНЫЯ «ПТУШКІ» ШЫРОКАГА ФУНКЦЫЯНАЛУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Аэрадром Асоўцы побач з горадам Бяроза, які яшчэ не так даўно прымаў знішчальнікі МіГ-29, трансфармаваўся ва ўзлётна-пасадачную пляцоўку для ваенных дронаў. Тут размясціўся цэнтр падрыхтоўкі і прымянення беспілотных авіяцыйных комплексаў. Паспрабую прымераць на сябе прафесію аператара БПЛА.

## Утрымаць 12,5 кілаграма

Пачынаем з інструктажу. Далей — зборка дрона. Першы на запуск — беспілотнік «Суперкам-350». Працэс нагадвае гульню «Лега». Дэталяў, праўда, значна менш. А самі дзеянні не такія ўжо і складаныя. Важна паслядоўна сабраць часткі дрона і добра замацаваць. Калі будзе нешта няправільна сабрана, то ён проста ўпадзе, як звычайны самалёт, і разаб'ецца.

«Суперкам-350» прызначаны для выканання работ па аэрафотаздымцы і відэаманіторынгу. Працягласць палёту — 4,5 гадзіны з перадачай інфармацыі на адлегласці да 100 кіламетраў. Вышыня — пяць тысяч метраў. Хуткасць — да 120 км/г. У гэтай мадэлі дзве мэтавыя нагрузкі. Адна — бачнага дыяпазону. Другая — інфрачырвонага, гэта калі камера ўлоўлівае цеплавое выпраменьванне ад усіх паверхняў.

Нарматыў па зборцы — 10 хвілін. Але можна справіцца значна хутчэй. На ваенных міжнародных гульнях беларускія аператары збіралі дроны за хвіліну пяцьдзясят секунд.

Час запускаць! Каб беспілотнік узняўся ў паветра, трэба зрабіць шэраг маніпуляцый: вызначыць напрамак ветру, нацягнуць эластычную катапульту, замацаваць яе да беспілотніка, адысці далей і... адпусціць.

Беспілотнік апынуўся ў мяне ў руках. 12,5 кілаграма трэба адцягнуць на метраў 15 назад і ўтрымаць. Запускаецца ён з гэтага ж становішча. Трэба крыху прысесці на левую нагу. Зрабіць прагін назад. Затым запускаецца рухавік. Толькі пасля гэтага можна адпускаць дрон.

Патрэбна вельмі добрая фізічная падрыхтоўка, бо ўтрымацца на такім нацяжэнні вельмі складана, — адчуваю, як гараць мышцы. Запускае беспілотнік тэхнік разліку. Сам аператар ажыццяўляе ўсю падрыхтоўку, зборку, праверку. Ён можа дапамагчы тэхніку, бо аднаму справіцца з гэтым дастаткова складана.

На старт, увага, марш! Узляцеў! Наступныя 3,5 гадзіны ён будзе выконваць баявую задачу па разведцы мясцовасці. А кантралююць яго аператары з пункта кіравання, але пра гэта крыху пазней.

## Да 1,5 тысячы кіламетраў — без кіравання аператара

Наступны на ўзлёт — «Суперкам-150». Гэты беспілотнік выконвае практычна тыя ж функцыі, што і яго старэйшы брат, толькі характарыстыкі ў яго крыху іншыя. Час палёту складае дзве гадзіны. Хуткасць развівае такую ж, а вось радыус дзеяння меншы. Яго бясспрэчны плюс у кампактнасці. Акрамя аператыўных задач па маніторынгу і разведцы мясцовасці, гэтая мадэль выдатна падыдзе для высокадакладнай аэрафотаздымкі мясцовасці.

Экскурсія па вайсковай часці працягваецца. Мы на пункце кіравання беспілотнымі лятальнымі апаратамі. Адсюль ажыццяўляецца арганізацыя і кантроль за палётамі. Унутры абсталяваны два працоўныя месцы для аператараў, якія і адсочваюць усе перамяшчэнні беспілотніка. Я назвала б яго кабінетам на колах. Унутры камфортна. Два месцы: аператар кіравання і аператар камеры. Адзін кіруе, другі назірае. Кіраванне нагадвае камп'ютарную гульню.

...З задання вяртаецца першы беспілотнік. Вось першы круг, пайшоў на другі і пасадка... На мой погляд, прызямліўся жорстка.

— Такое бывае з-за ўзмацнення ветру, парываў, розных метэаўмоў, але гэта ўсё ў межах нормы, — кажа аператар.

Наступны на ўзлёт — усім вядомы беспілотнік «Бусел» айчыннай вытворчасці. Яго першы палёт адбыўся ў снежні 2011 года. Выпрабаванні прайшлі паспяхова. Таму неўзабаве дрон пайшоў у серыйную вытворчасць. Хуткасць палёту — 80 км/г. Вышыня — 3000 метраў. Дрон можа праляцець у аўтаматычным рэжыме да паўтары тысячы кіламетраў без кіравання аператара. Аэрафотаздымкі захоўваюцца ў бартавой памяці. Каб іх атрымаць, неабавязкова чакаць прызямлення беспілотніка, дастаткова, каб ён вярнуўся ў зону прыёму відэасігналу.

У нашы дні ніводны ваенны канфлікт у свеце не абыходзіцца без прымянення беспілотнай авіяцыі. Магчымасці БПЛА пастаянна ўзрастаюць, а шматфункцыянальнасць стала іх адметнай рысай. Сёння акцэнт у распрацоўцы зроблены і на ўдарныя авіяцыйныя комплексы. Айчынная ваенная прамысловасць ужо ні адзін год працуе ў гэтым кірунку. Вынік ёсць! Сёлета ўдарныя беспілотнікі павінны паступіць у войскі.

**Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ.**
**Фота з архіва аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Долар ЗША працягвае здаваць пазіцыі



Долар ЗША застаецца асноўнай рэзервовай валютай у свеце, аднак працягвае здаваць пазіцыі ў міжнародных рэзервах нетрадыцыйным валютам. Гэта адзначаецца ў аглядзе МВФ. Аўтары дакумента падкрэсліваюць, што паслабленне пазіцый долара ЗША ў апошнія два дзесяцігоддзі суправаджалася ростам доляй не іншых валют «вялікай чацвёркі»: еўра, японскай ены і брытанскага фунта, а менавіта нетрадыцыйных валют. Сярод іх, у прыватнасці, аўстралійскі, канадскі і сінгапурскі долары, паўднёвакарэйская вона, валюты краін Паўночнай Еўропы і кітайскі юань. У МВФ упэўнены, што скарачэнне папулярнасці долара ЗША пры росце долі нетрадыцыйных рэзервовых валют у сусветных рэзервах выклікана палітыкай шэрагу іх буйных трымальнікаў, у тым ліку Расіі. Сярод дадатковых фактараў, якія схіляюць трымальнікаў да дыверсіфікацыі рэзерваў, у МВФ называюць эканамічную фрагментацыю і патэнцыяльную «рэарганізацыю эканамічнай і фінансавай дзейнасці ў асобныя блокі», якія не перасякаюцца.

## Акцыя пратэсту ў Буэнас-Айрэсе перарасла ў сутыкненні з паліцыяй

Некалькі тысяч пратэстоўцаў сабраліся напярэдадні вечарам у сталіцы Аргенціны перад пачаткам разгляду ў верхняй палаце парламента прадстаўленага ўрадам прэзідэнта Хаўера Мілея пакета рэформ. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости». Беспарадкі пачаліся, калі пратэстоўцы паспрабавалі абысці сістэму агароджаў, створаную для ізаляцыі кангрэса. Паліцыя прымяніла супраць маніфестантаў слёзатачывы газ, вадамёты і гумовыя кулі. Падчас акцыі пратэстоўцы падпалілі некалькі машын, якія стаялі на плошчы. Акрамя таго, маніфестанты закідалі праваахоўнікаў камянямі. Паводле звестак СМІ, мінімум пяць чалавек шпіталізаваны з сімптомамі атручэння слёзатачывым газам. Яшчэ некалькім дзясяткам дапамога аказвалася на месцы. Пазней прэс-служба прэзідэнта Аргенціны заявіла, што ўдзельнікі пратэсту, якія ўступілі ў сутыкненні з паліцыяй, здзейснілі спробу дзяржперавароту.



## У Тайландзе адбыўся рэдкі выпадак нараджэння сланянят-блізнят



У горадзе Аютхая ў Тайландзе на свет з'явіліся сланяняты-блізняты. Рэдкі для папуляцыі сланоў выпадак адбыўся ў запаведніку Elephantstay, дзе на дабрачыннай аснове займаюцца абаронай і доглядам гэтага віду жывёл. Паводле інфармацыі аўстралійскай вяшчальнай карпарацыі Australian Broadcasting Corporation, 36-гадовая сланіха Джамджуры нарадзіла сланяня. Аднак праз 18 хвілін пасля першых родаў на свет з'явілася другое сланяня, што заспела наглядчыкаў знянацку. Паведамляецца, што сланіха ў паніцы зламала шчыкалатку аднаму з наглядчыкаў. Вага нованароджаных сланянят склала 80 і 60 кілаграмаў адпаведна. Цяпер яны знаходзяцца пад назіраннем. У карпарацыі назвалі двайныя роды азіяцкай сланіхі «цудам прыроды».

Пра медыцыну і не толькі



# Выратаваць жыццё

**Штогод 14 чэрвеня ў розных краінах свету адзначаюць Сусветны дзень донара крыві. Традыцыйна ў гэту дату ўшаноўваюць людзей, якія добраахвотна і бязвыплатна здаюць кроў, і інфармуюць аб неабходнасці рэгулярнага донарства для выратавання жыцця пацыентаў, якія сутыкнуліся з цяжкім захворваннем ці маюць патрэбу ў пэўнай аперацыі.**

З 21 красавіка 2023 года ўступіў у сілу Закон «Аб донарстве крыві і яе кампанентаў» у новай рэдакцыі. У ім змяніліся некаторыя падыходы да донарства, у прыватнасці, знівеліравалася такое паняцце, як бязвыплатны донар. Засталося права на кампенсацыю затрат у грашовым эквіваленце, і чалавек, які хоча здаць кроў, можа зрабіць тое па адпаведных расцэнках. Для гэтага можна звяртацца або ў пункты пералівання крыві, або ў РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій. Калі ж чалавек хоча здаць кроў бязвыплатна, ён усё роўна атрымае пэўную кампенсацыю. У такім выпадку выдаюцца не грашовыя сродкі, а набор для харчавання. Ён складаецца са спецыяльных прадуктаў, якія хутка аднаўляюць энергію.

Ёсць і іншая падтрымка донараў, асабліва ганаровых, у нашай краіне. Пры 20 бязвыплатных і 40 платных данацыях донар атрымлівае статус ганаровага. Для іх ёсць розныя прэферэнцыі, у тым ліку штомесячная прыбаўка да пенсіі.

У Сусветны дзень донара, хоць і няма такога паняцця, як бязвыплатнае донарства ў новым законе, мы кажам пра бязвыплатнасць і дабравольнасць. У цывілізаваных краінах лічыцца, што кожны чалавек хаця б раз у жыцці павінен стаць донарам. Пасыл такі: здай кроў для самога сябе, бо мы не можам ведаць, што здарыцца з намі заўтра, паслязаўтра ці праз шмат гадоў. Магчыма, не з намі, а з кімсьці з блізкіх.

Асабіста я — за бязвыплатнае донарства. Таксама з'яўляюся донарам і заўсёды здаваў кроў бясплатна. Гэта прынцыповая для мяне пазіцыя. Калі ты дапамагаеш чалавеку, выратоўваеш яго жыццё, гэта павінна ісці ад чыстага сэрца. Калі б наша грамадства да гэтага прыйшло, было б добра. Аднак, з іншага боку, я разумею, калі хтосьці здае кроў, каб атрымаць дадатковыя грошы, і нічога ганебнага ў гэтым не бачу. Так чалавек для сябе вырашыў і мае на гэта права.

Таму гэтыя два кірункі донарства павінны ісці паралельна. Так, з кожным годам становіцца больш бязвыплатных донараў, і тое можна толькі вітаць. Пры гэтым перайсці да толькі бязвыплатнай здачы крыві мы пакуль не гатовы. У такім выпадку запасы крыві скароцяцца, а гэтага дапускаць нельга.

Па вялікім рахунку, не важна, бязвыплатна ці за грошы вы здаяце кроў, важна тое, што адна данацыя, а яна складае 450 мл, выратоўвае чатыры чалавечыя жыцці. У сучаснай медыцыне адышлі ад практыкі пералівання цэльнай крыві. Апошняя раздзяляецца на розныя фракцыі: эрытрацыты, лейкацыты, трамбацыты, плазма, альбумін і інш. І ў залежнасці ад таго, захворванне гэта ці аперацыя, бярэцца патрэбны кампанент.

У нашай краіне сфарміраваны банк крыві. Такая сусветная практыка, што ён існуе ў кожнай краіне. І гэта важная рэч, бо здараюцца катаклізмы прыроднага, тэхнагеннага характару, калі ёсць пацярпелыя і трэба максімальна хутка пераліць кампаненты крыві. Да таго ж ёсць руцінная планавая работа ў медыцынскіх стацыянарах, тыя ж аперацыі. Цяпер тэхналогіі далёка пайшлі, няма такіх крывавых аперацый, як гэта было 20—25 гадоў таму. Сёння яны ў пераважнай большасці бяскроўныя. Калі раней замянялі тазасцегнавы сустаў, у пацыентаў былі вялікія крывастраты, і падчас аператыўнага ўмяшання было неабходна пераліванне крыві. Цяпер крывастраты нязначныя нават пры такіх сур'ёзных аперацыях.

Аднак кроў і яе кампаненты ўсё роўна патрабуюцца — пры розных анкалагічных хваробах, у прыватнасці захворваннях крыві, калі недастаткова выпрацоўваецца кампанентаў крыві і пастаянна даводзіцца праводзіць дадатковае іх уліванне, пры анеміях, калі нізкі ўзровень гемаглабіну і інш. У працэсе штодзённай работы стацыянарнай службы кампаненты крыві нярэдка прымяняюцца, асабліва на ўзроўні такіх аддзяленняў, як рэанімацыйнае, хірургічнае, траўматалагічнае, інфекцыйнае.

Чырвоны Крыж хоць і не займаецца нарыхтоўкай крыві, але як партнёр сістэмы аховы здароўя інфармацыйна і тэхнічна дапамагае РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, а таксама станцыям пералівання, якія знаходзяцца ў Мінску, абласных гарадах, у папулярызацыі менавіта бязвыплатнага донарства. З году ў год у Сусветны дзень донара мы прыцягваем да гэтай акцыі па ўсёй краіне каля тысячы чалавек.

Раней такія акцыі мы арганізоўвалі ў сваіх офісах, запрашалі здаць кроў розных людзей: дэпутатаў парламента, кіраўнікоў міністэрстваў, медыйных асоб, спартсменаў. Яны сваім прыкладам папулярызавалі донарства. Сумесна з РНПЦ сёлета другі год запар мы праводзім забор крыві на пляцоўцы перад Міністэрствам аховы здароўя. Прыемна адзначыць, што летась, калі акцыя праводзілася там упершыню, прыцягнулі вялікую колькасць ахвотных. Людзі, якія ішлі на работу і бачылі пляцоўку, спыняліся і здавалі кроў. Мы нават крыху не спраўляліся, донарам даводзілася нейкі час чакаць у чарзе.

Сёлета мы разгарнулі дадатковыя месцы. Да перасоўнага комплексу РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій арганізавалі тры працоўныя месцы ў модулі Чырвонага Крыжа. Плануем прыняць больш за сто чалавек і запрашаем далучыцца ўсіх ахвотных. Такім чынам вы можаце дапамагчы іншаму чалавеку пазбавіцца ад той ці іншай хваробы ці нават выратаваць чыёсьці жыццё.

**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.**

# Аднапакаёвыя кватэры імкліва даражэюць

## «КВАДРАТ» ПЕРАСЯГНУЎ МЯЖУ Ў 1600 ДОЛАРАЎ

Рынак сталічнага жылля працягвае біць рэкорды. У сакавіку колькасць заключаных здзелак куплі-продажу перавысіла адзнаку ў 1900, а ў красавіку, па абноўленых даных, іх было ўжо 1882. У папярэднім месяцы было прададзена амаль 1600 жыллёвых аб'ектаў. А, між іншым, сярэдні паказчык для гэтых месяцаў складае 1200—1300 здзелак. Звесткі за май яшчэ будуць дапаўняцца, але ўжо відавочна, што будзе вызначаны новы гістарычны рэкорд як па абсалютных лічбах, так і па працягласці анамальнага попыту.

Такі высокі попыт працягвае рухаць цэны ўверх, бо аднапакаёвая кватэра цяпер каштуе па максімуме з 2015 года. Згодна з рэальнымі продажамі, кошт квадратнага метра маленькіх кватэр перасягнуў мяжу ў 1600 долараў ($1612).

На думку нашага эксперта, штомесячны рост цэн на самыя запатрабаваныя кватэры, адносна стабільны курс долара і магчымасць крэдытавацца пад стаўку ад 14,4 % гадавых (а ў тых, хто стаіць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, і зусім ёсць магчымасць узяць крэдыт у Беларусбанку пад 11,5 %) падтрымлівалі такі рэкордны попыт на працягу першых пяці месяцаў года.

Найбольшую перавагу пакупнікі традыцыйна аддавалі аднапакаёвым кватэрам — іх доля на рынку Мінска склала 43 % і за месяц вырасла на тры працэнтныя пункты. Менш, чым у сакавіку, куплялі двухпакаёвыя кватэры, на якія прыйшлося 33 % ад усіх здзелак. Трохпакаёвыя кватэры выбіралі ў 20 % выпадкаў. Кватэры ў новых гатовых дамах, уведзеных у эксплуатацыю ў 2022—2023, куплялі ў красавіку ўжо крыху часцей — у 10 % выпадкаў.

**Цяпер кватэры ў Мінску ацэньваюцца такім чынам: аднапакаёвыя — 57 500 долараў, двухпакаёвыя — 70 000 долараў, трохпакаёвыя — 85 500 долараў.**

Сярод раёнаў часцей за іншыя выбіралі Кастрычніцкі і Цэнтральны, радзей — Савецкі і Заводскі. Менш, чым у іншыя месяцы, пакупнікі цікавіліся кватэрамі ў сучасных панэльных дамах. Часцей выбіралі старыя і тыпавыя панэльныя дамы.

Сярэдняя цана ўсіх прададзеных у Мінску кватэр па выніках красавіка паказала чарговы рост — квадратны метр падаражэў у сярэднім на 1 % і склаў 1479 долараў.

Пры гэтым цэны выраслі ў асноўным толькі на самыя запатрабаваныя аднапакаёвыя кватэры — плюс 1,3 %, дасягнуўшы адзнакі ў 1598 долараў. «Квадрат» двухпакаёвай кватэры падняўся нязначна і дасягнуў усяго 1410 долараў, а трохпакаёвай кватэры — 1310 долараў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сярэдняя цана ўсёй аднапакаёвай кватэры была роўная ў красавіку 57 100 долараў, двухпакаёвай — 63 000 долараў, а трохпакаёвай — 81 500 долараў.

## У МАІ ЦЭНЫ «ЗАМЕРЗЛІ»

У мінулым месяцы цэны на кватэры ў Мінску засталіся на месцы, калі глядзець звесткі па прапановах на другасным рынку на сайтах нерухомасці. У той жа час квадратны метр па рэалізаваных кватэрах (даныя ўзяты з афіцыйнага сайта Нацыянальнага кадастравага агенцтва Беларусі) стаў даражэйшы. Калі браць з разліку ў беларускіх рублях, у сталіцы кошт жылля знізіўся з 4583 рублёў да 4514 рублёў за квадратны метр.

У маі ў Мінску было прададзена 1596 кватэр (уключаючы долі і кватэры, прададзеныя па долях). З іх рэалізавана



655 аднапакаёвых кватэр, або 41 % ад усіх здзелак. 34 % усіх набытых кватэр — гэта двухпакаёвыя, або 535 здзелак. На апартаменты з трыма і больш пакоямі прыйшліся тыя, што засталіся 25 %, або 406 заключаных дагавораў. У маі было прададзена на 15 % менш кватэр, чым у мінулым месяцы (1596 супраць 1882 — у красавіку).

Мы прааналізавалі цэны прададзеных кватэр на другасным рынку (выключаючы кватэры, прададзеныя па долях). Аказалася, што ў сярэднім у маі кошт аднаго квадратнага метра ў Мінску склаў 1497 долараў, або 4799 рублёў. У параўнанні з папярэднім месяцам адбыўся рост на 2,9 %.

Калі браць цану квадратнага метра аднапакаёвых кватэр, то яна на 7,7 % вышэйшая за сярэднюю і складае 1612 долараў, або 5168 рублёў. Цана квадратнага метра двухпакаёвых кватэр — 1459 долараў, або 4677 рублёў, гэта значыць, яна на 3,6 % вышэйшая за сярэднюю па горадзе. Квадратны метр у трохпакаёвых кватэрах, наадварот, на 10,4 % таннейшы, чым у сярэднім па горадзе, і роўны 1342 доларам, або 4302 рублі.

Для параўнання: цана квадратнага метра жылля ў Мінску ў аб'явах аб продажах кватэр на сайце нерухомасці складае блізу 1408 долараў, гэта значыць, на 6,3 % ніжэй. Ёсць усе падставы для далейшага росту цэн.

Цяпер кватэры ў Мінску ацэньваюцца такім чынам: аднапакаёвыя — 57 500 долараў, двухпакаёвыя — 70 000 долараў, трохпакаёвыя — 85 500 долараў. Даражэй за ўсё ў Мінску ў маі купілі кватэру свабоднай планіроўкі плошчай 197 квадратных метраў за 357 000 долараў, ці крыху больш за 1 145 000 рублёў. Кватэра знаходзіцца на вуліцы Ратамскай у доме 2018 года пабудовы. Крыху танней была прададзена прасторная трохпакаёвая кватэра плошчай 122 квадратныя метры на праспекце Незалежнасці. Яе цана — 322 000 долараў, або 1 033 000 рублёў.

## ПАКУПНІЦКАЯ АКТЫЎНАСЦЬ РАСЦЕ І НА ПЕРЫФЕРЫІ

Сталічны попыт у пачатку 2024 года аказаўся рэкордным за ўсю гісторыю назірання: штомесяц заключалася максімальная для гэтых месяцаў колькасць здзелак з кватэрамі. У параўнанні з 1 кварталам мінулага года колькасць здзелак куплі-продажу павялічылася на 23 %.

Пры гэтым 1-ы квартал прайшоў пад знакам высокага попыту не толькі ў Мінску, але і па ўсёй Беларусі — ва ўсіх абласных цэнтрах колькасць набытых кватэр павялічылася адносна мінулага года. Усталяваўшы новы рэкорд для пачатку года, найбольш попыт вырас у Гродне, дзе за студзень—сакавік было набыта амаль 1000 кватэр, што на 70 % вышэй за леташні ўзровень.

У Магілёве заключылі 550 здзелак, што на 15 % больш, чым за падобны перыяд мінулага года. У Віцебску і Гомелі пакупніцкая актыўнасць вырасла на 10 % у абодвух выпадках, а ў Брэсце — на 8 %. Больш за ўсё здзелак за 1-ы квартал гэтага года было заключана ў Гродне (амаль 1000) і Гомелі (771), а таксама ў Віцебску (амаль 650).

Сярод буйных гарадоў краіны таксама назіраўся рост попыту. Найбольш вырас попыт на кватэры ў Салігорску, дзе купілі 200 кватэр, што на 58 % больш за леташні ўзровень. У Полацку купілі 170 кватэр — плюс 41 %.

Таксама прыкметны рост попыту ў Барысаве, дзе была праведзена купля 261 кватэры (плюс 32 %) і ўстаноўлены новы рэкорд для пачатку года. Аднак ёсць гарады, дзе попыт, наадварот, знізіўся. Гэта Ліда (мінус 6 %), Пінск (мінус 2 %) і Мазыр (мінус 0,6 %).

У выніку сумарны попыт у рэгіёнах у першым квартале 2024 года не ўсталяваў новага рэкорду — за тры месяцы было заключана каля 5600 здзелак, што саступае ўзроўню 2019—2021 года, калі аб'ём набытых кватэр складаў каля 6300—8400 адзінак.

Найбольшым попытам у жыхароў краіны карысталіся двухпакаёвыя кватэры — з імі ў сярэднім заключылі 43 % усіх здзелак. Максімальная доля «двушак» была ў Лідзе, Гродне і Баранавічах — тут амаль кожная другая прададзеная кватэра была двухпакаёвай.

Аднапакаёвыя кватэры набывалі звычайна ў 29 % выпадкаў. Найбольш нізкай іх доля ў агульным попыце была ў Гродне — толькі 18 %. А найбольш высокай — у Мазыры і Віцебску, дзе такія кватэры купілі ў 36 % і 35 % ад усіх здзелак.

Трохпакаёвыя кватэры ў сярэднім займалі 24 % усіх здзелак. Найменшая доля шматпакаёвых кватэр была ў Полацку і Віцебску (17 % і 19 % адпаведна). У Гродне і Пінску, наадварот, менавіта трохпакаёвая была амаль кожнай трэцяя з усіх прададзеных кватэр.

Варта адзначыць, што асноўная маса прададзеных кватэр у буйных гарадах рэгіёна размяшчалася ў дамах 1971—1990 гадоў пабудовы, крыху радзей выбіралі кватэры ў дамах яшчэ больш старых — ад 1950 да 1971 года пабудовы. Кватэры ў новых дамах (пабудаваных пасля 2010 года) традыцыйна часцей фігуравалі ў здзелках у Гродне — 56 % ад усіх здзелак. У Брэсце гэты паказчык роўны 28 %.

З-за высокага попыту, які назіраецца з мінулага года, у Мінску сярэдні кошт прададзеных кватэр з мая 2023 да мая 2024 года вырас на 11 %. А з пачатку года — на 6 %.

Рост цэн закрануў і рэгіёны. Ва ўсіх абласных цэнтрах сярэдняя цана квадратнага метра, згодна са здзелкамі куплі-продажу, вырасла. Істотней за ўсё ў Віцебску, дзе адносны рост у 1,5 раза большы, чым у Мінску, — плюс 9 %. Таксама рост назіраецца і ў Гомелі, дзе за квартал «квадрат» падаражэў у сярэднім на 7 %. У Магілёве, Гомелі і Гродне рост цэн склаў 4 %, 2 % і 1 % адпаведна.

За год сярэднія цэны квадратнага метра выраслі ва ўсіх абласных цэнтрах: у Брэсце — на 11 %, у Магілёве і Гомелі — на 8 % у абодвух выпадках, у Віцебску — на 6 %, у Гродне — на 0,3 %.

Сярод буйных гарадоў максімальны рост сярэдніх цэн квадратнага метра ў заключаных здзелках адзначаўся ў Оршы і Барысаве (плюс 18 % і плюс 13 % да мінулага квартала), крыху меншы (плюс 6 %) — у Маладзечне і Наваполацку. Адмоўнай дынаміка была ў трох гарадах: Лідзе (мінус 4,4 %), Мазыры (мінус 3 %) і Бабруйску (мінус 2 %).

За год сярэднія цэны квадратнага метра выраслі амаль ва ўсіх буйных гарадах: мацней за ўсё ў Оршы — плюс 10 %, у Пінску, Барысаве і Маладзечне — плюс 8 %. Выключэннем сталі Ліда і Полацк, дзе квадрат стаў таннейшы на 3 % і 1 % адпаведна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Лета бярэ сваё

### Да серады хваля цяпла дасягне плюс 30 градусаў

**Пачатак другой дэкады чэрвеня быў капрызны як ніколі. Рэзкая змена надвор'я — ад пахаладання да амаль што ліпеньскай спякоты і наадварот — і ўсё гэта на працягу чатырох-пяці дзён. Характэрна, што ў гэты час тэмпературны рэжым быў выключна кантрасным, калі ўначы паказанні тэрмометраў апускаліся да плюс 5—7 градусаў, а днём падымаліся месцамі да 28 цяпла. Разам з тым у гэты час тэмпературны фон усё яшчэ будзе некалькі ніжэйшы, чым прапісана па календары. Атмасферныя франты і перамяшчэнне няўстойлівых паветраных мас будуць і далей уплываць на наша надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу чакаецца перавага воблачнага надвор'я. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, ноччу ў заходніх раёнах месцамі чакаюцца моцныя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах па ўсходзе Беларусі прагрымяць навальніцы. Вецер паўночны, паўночна-ўсходні слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы пачне павышацца і дасягне 8—14 градусаў, а максімальная днём — ад 16 да 22 градусаў, па ўсходзе — да 24 цяпла. Атмасферны ціск істотна не зменіцца.

У сярэдзіне месяца адаб'ецца ўплыў цёплай няўстойлівай паветранай масы. Пераменная воблачнасць. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Вецер няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 7 да 14 градусаў, а ўдзень — 18—25 цяпла.

Чарговая хваля ўпэўненага цяпла чакаецца ў нядзелю. У гэтыя суткі ноччу ўмовы надвор'я ў асноўным будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, раніцай і днём адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў і няўстойлівых паветраных мас, якія распаўсюджваюцца з тэрыторыі Украіны. Пераменная воблачнасць. Ноччу па паўднёвым усходзе, днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы, ноччу і раніцай слабы туман. Вецер няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 7 да 13 цяпла, па паўднёвым усходзе да плюс 15, а днём ужо ўсё 22—27 цяпла.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у пачатку наступнага працоўнага тыдня чарговы франтальны раздзел прынясе ў нашу краіну новыя порцыі ападкаў, і калі ў панядзелак кароткачасовыя дажджы будуць адзначацца ў большасці раёнаў, то ў далейшым з ростам атмасфернага ціску плошча іх распаўсюджвання стане менш. Месцамі дажджы будуць суправаджацца навальніцамі.

У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца слабы туман. Уначы тэмпература паветра дасягне плюс 10—17 градусаў, а ўдзень — 19—26 градусаў.

Чакаюцца месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы і навальніцы ў аўторак. Ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад 10 да 17 градусаў, а ўдзень — ад плюс 19 да плюс 26 цяпла. Па паўднёвым захадзе чакаецца да плюс 29 градусаў.

У сераду камфортныя тэмпературы для раслін будуць назірацца і ў цёмны час сутак. Ноччу 19 чэрвеня надвор'е будзе пераважна без ападкаў, а днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца слабы туман. Уначы сіноптыкі абяцаюць ужо 11—18 градусаў, а ўдзень — цалкам летнія 23—30 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «НАПЕРАД У МІНУЛАЕ» 600-Ы РАЗ

**У нядзелю, 16 чэрвеня, на тэлеканале «Беларусь 3» выйдзе шасцісоты выпуск праграмы «Наперад у мінулае». А гэта значыць, што нас чакае і юбілейная прэм'ера народнай песні ў сучаснай апрацоўцы.**



Ужо 12 гадоў творчая група праекта «Наперад у мінулае» вандруе па Беларусі і фіксуе на камеру нематэрыяльную культурную спадчыну розных рэгіёнаў краіны, якую беражліва захоўваюць фальклорныя гурты і проста апантаныя людзі. Па ўмовах праекта, носьбіты аўтэнтычнай культуры выконваюць захаваныя ці адноўленыя абрады, народныя песні і побытавыя танцы, дэманструюць адметнасці мясцовых гаворак, распавядаюць гісторыі, байкі і легенды паселішчаў. Дарэчы, за ўвесь час існавання праграмы было запісана больш за паўтары тысячы народных песень!

«На гэтым творчая група праекта не спыняецца. Кожную вёску можна наведваць шмат разоў і заўсёды вяртацца ў студыю з новым матэрыялам — запісамі народных песень і кадрамі традыцыйных і аўтэнтычных беларускіх абрадаў», — дзеліцца **вядучая Аксана ВЕЧАР.**

Новы выпуск праекта «Наперад у мінулае» пазнаёміць тэлеаўдыторыю з абрадам «Тройца» ў выкананні народнага ансамбля народнай песні і музыкі «Шчодрыца». Традыцыйна напрыканцы праграмы ўвазе гледачоў прадставяць народную песню ў сучаснай аранжыроўцы. Гэтым разам саўндпрадзюсар Генадзь Сыракваш і ансамбль «Чараўніцы» падрыхтавалі новую версію песні «Пойдзем, дзевачкі».

Не прапусціце шасцісоты выпуск праграмы «Наперад у мінулае» ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала ў нядзелю, 16 чэрвеня, у 10:00.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 200

**Сённяшні наш выпуск юбілейны, двухсоты з моманту аднаўлення шахматнага клуба ў 2016 годзе. У якасці своеасаблівага сувеніра сваю задачу прапаноўвае для рашэння вядучы аддзела (*гл. дыяграму*).**




**Белыя:** Kpg8, Фа3, Сс1, Се6, Ke5, пп. d4, d5, h4, h5 (9).

**Чорныя:** Kpf6, Ce2, Kc5, Kf4, пе7 (5).

Мат за два хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.**

* * *

Наш чытач, брэсцкі шахматны кампазітар і журналіст Віктар Жук выдаў у якасці дадатку да бюлетэня «Альбіна» сваю анталогію «Шахматная кампазіцыя на Брэстчыне». Выданне складаецца з дзвюх частак (80 і 66 старонак). Яны змяшчаюць 2222 кампазіцыі (1236 + 986). Гэта падборкі твораў 33 вядомых у рэгіёне і за яго межамі шахматных кампазітараў (з фотапартрэтамі і кароткімі біяграфіямі аўтараў), а таксама звыш сотні задач асобных складальнікаў, што былі змешчаны ў розныя гады ў мясцовым друку.

У 2014 і 2016 гадах В. Жук выпусціў дзве часткі першага выдання сваёй анталогіі. Цяперашняе, другое, выданне значна дапрацавана і пашырана.

* * *

Прызавую тройку рэспубліканскай спартакіяды па месцы жыхарства (дзе не маглі ўдзельнічаць дзеці са спартыўных школ) склалі каманды з Брэста, Полацка і Гродна. Гэты турнір праводзіўся ў Пінску.

На мемарыяле Уладзіміра Дварковіча ў казахстанскім горадзе Актобе (90 удзельнікаў) Міхаіл Нікіценка фінішаваў шосты.

У турніры па бліцы на сайце chess.com (739 удзельнікаў) перамог Уладзіслаў Кавалёў (10 балаў з 11), а Дзяніс Лазавік заняў 11-е месца. У другім такім турніры ў Д. Лазавіка 9-е месца з 671.

* * *

Прапануем некалькі партый сёлетняга першынства Беларусі да 20 гадоў.

Юлія Лявонава — Вікторыя Дорашава. 1. c4 e6 2. Kc3 d5 3. cd ed 4. d4 c6 5. Kf3 Cd6 6. Cg5 Ke7 7. e3 h6 8. Ch4 Cf5 9. Cd3 C:d3 10. Ф:d3 Kd7 11. 0-0 0-0 12. Лab1 Ле8 13. Лfc1 Лс8 14. b4 b5 15. a4 a6 16. a5 Kf8 17. Лс2 Фd7 18. e4 de 19. K:e4 Kd5 20. K:d6 Ф:d6 21. Cg3 Фе7 22. Фd2 Kd7 23. Ce5 f6 24. Cg3 g5 25. h3 Kf8 26. Лсс1 Kg6 27. Ле1 Фf8 28. Фс2 Kpg7 29. Л:e8 Ф:e8 30. Ле1 Фd7 31. Фс5 Kpf7 32. Kd2 Kgf4 33. C:f4 K:f4 34. Фс2 Kpg7 35. Фе4 Лf8 36. Kb3 Фd5 37. Kc5 Ле8, 0:1.

Вікторыя Дорашава — Маргарыта Бендзік. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 Cb4 4. a3 C:c3+ 5. bc c5 6. f3 Kc6 7. e4 d6 8. Ke2 b6 9. Cg5 h6 10. Ch4 Фс7 11. Cf2 Ka5 12. Kc1 Cd7 13. Фс2 Kh5 14. a4 f5 15. g3 Kf6 16. ef ef 17. d5 0-0-0 18. Cd3 Лde8+ 19. Ke2 g5 20. 0-0 h5 21. Лfe1 f4 22. gf g4 23. f5 Kh7 24. Ch4 gf 25. Kf4 Лhg8+ 26. Kph1 Лg4 27. Л:e8+ C:e8 28. Ле1 Л:h4 29. Л:e8+ Kpb7 30. Kg6 Kpa6 31. K:h4 Kg5 32. Ле3 Фg7 33. K:f3 Kh3 34. Фg2 Фh6 35. Ле7 Kf4 36. Фg7 Ф:g7 37. Л:g7 K:d3 38. f6 K:c4 39. f7 Ke3 40. Kpg1 Kf4 41. Kpf2, 1:0.

Вераніка Абрамкіна — Ксенія Норман. 1. d4 Kf6 2. Kf3 g6 3. Kbd2 d5 4. b3 Cg7 5. Cb2 0-0 6. e3 Kbd7 7. c4 c5 8. Ce2 b6 9. 0-0 Cb7 10. Лс1 Лс8 11. Ле1 e6 12. Лс2 Ke4 13. Фа1 f5 14. dc C:b2 15. Ф:b2 bc 16. b4 Фе7 17. cd C:d5 18. bc Kd:c5 19. Лес1 K:d2 20. K:d2 Ka4 21. Фе5 Л:c2 22. Л:c2 Фg7 23. Ф:g7+ Kp:g7 24. Cb5 Kb6 25. f4 Kpf6 26. Kb3 Ce4 27. Лс7 Kd5 28. Л:a7 Лс8 29. Kd4 K:e3 30. g3 Kg4 31. Kpf1 K:h2+ 32. Kpe2 Kg4 33. Cd7 Лс4 34. Ce8 Kh6 35. Kb5 Лс8 36. Kd6 Лd8 37. K:e4+ fe 38. Cc6 Kf5 39. Kpe1 K:g3 40. a4 e3 41. Cf3 Лd2, 0:1.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Фb3! Правільна адказалі Леанід Шацько, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

З нагоды

# «Беларусь 24» — лаўрэат прэміі «ТІБА»

**Скарбонка «Бэлтэлерадыёкампаніі» на цырымоніі XXI конкурсу «Інтэрнэт-прэмія «ТІБА» папоўнілася шэрагам узнагарод. Медыяхолдынг адзначылі Спецыяльным дыпломам «За распрацоўку сайта belarus24.by», а сайт тэлеканала «Беларусь 24» узнагародзілі Спецыяльным дыпломам журы.**

